МУЖНАСЦЬ КАМСОРГА

У Оршы, у парку Герояў, разыходзяцца ад Вечнага агню ў выглядзе пяцікутнай зоркі абсаджаныя маладымі дрэўцамі алеі. Кожная з іх носіць імя аднаго з адважных воінаў — тых, хто здзейсніў подзвіг пры вызваленні тутэйшых мясцін ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Адна з алей названа імем рускай дзяўчыны Ганны Аляксееўны Нікандравай.

...Сустрэча з ворагам чакалася непадалёк ад аўтамагістралі Масква—Мінск. Наперадзе — мінныя палі, супрацьтанкавыя рвы, варожыя дзоты. І вось пасля артылерыйскай падрыхтоўкі 426-ы стралковы полк кінуўся ў атаку.

Батальён, у якім была камсоргам Аня Нікандрава, штурмаваў вёску Кіраўка, дзе засялі фашысты. Глыбока эшаліраваную абарону ворага моцна пашкодзіў артылерыйскі агонь, але гітлераўцы шалёна супраціўляліся.

Байцы залеглі, наперадзе варожая траншэя. І тады ва ўвесь рост узнялася яна, дзяўчына, старшы лейтэнант, і з воклічам: «Камуністы, камсамольцы, за мной, наперад!» — кінулася да мастка праз супрацьтанкавы роў, за якім была траншэя. І вось у гэтай траншэі закіпеў рукапашны бой. У ход пайшлі гранаты, штыкі, прыклады аўтаматаў. Рукапашная не для жанчын. Нехта з нашых байцоў пераханіў руку гітлераўца з фінкай — удар прызначаўся Нікандравай, хтосьці прыкрыў яе сваім целам, калі побач выбухнула граната...

І зноў яна павяла ў бой байцоў, і з наступнай траншэі выбілі гітлераўцаў. Над вызваленай вёскай залунаў чырвоны сцяг. Але Аня Нікандрава не бачыла ўжо ні нашага флага, ні імклівых «трыццацьчацвёрак», якія вырваліся наперад, развіваючы наступленне. Варожы кулямётчык доўгай чаргой прашыў яе грудзі, прабіў сэрца...

Астанкі Героя Савецкага Саюза, дзяўчыны-камсамолкі з вёскі Барашкіна Пскоўскай вобласці захаваны ў скверы ў Дуброўна. Як і ў Оршы, тут адна з вуліц райцэнтра носіць яе імя. На ўрачыстых лінейках, якія праводзяцца побач, юныя, пінеры, уступаючы ў камсамол, клянуцца быць падобнымі на гераіню, гатак жа як і яна, любіць Савецкую Радзіму.

ПІСЬМО З САМАЛЁТА ПРЫМІЦЕ...

Гітлераўцы рваліся да Масквы. За кожны метр зямлі ішлі крывапралітныя баі. Лётчыкі амаль не вылазілі з кабін. Маторы не паспявалі астынуць, як пагружаўся боезапас. І чырваназорныя бамбардзіроўшчыкі ўзляталі граміць ворага.

У адзін з такіх гарачых, баявых дзён камандзір палка выклікаў да сябе ў ліку іншых пілотаў і лейтэнанта Уладзіміра Завадскага.

— Ноччу, таварышы, пойдзеце далёка на захад. Маршрут, — камандзір схіліўся над картай, жэстам запрашаючы да стала лётчыкаў,— пралягае над Вязьмай, Смаленскам. Бомбавы ўдар наносіце на буйному чыгуначнаму вузлу Орша. Удар павінен быць дакладным, эфектыўным, бо аб нашым палёце ведаюць падпольшчыкі. Сігналамі з зямлі яны пакажуць самыя важныя аб'екты гітлераўцаў, воінскія эшалоны, якія стаяць на пуцях.

Орша! Трывожна і радасна забілася сэрца Уладзіміра Завадскага. Родны горад... Там нарадзіўся, вырас. Бацька працаваў на чыгунцы, якая з дзяцінства так палюбілася і Валодзю. Ён скончыў сяредняю школу, пачаў працаваць у вуздавым камітэце камсамола. А яшчэ яго вабіла неба. І юнак вучыўся ў аэраклубе... «Як яна цяпер, родная Орша?»

...І вось група бамбардзіроўшчыкаў у звонкім марозным небе. На вялікай вышыні прайшлі лінію фронту. Ззаду застаўся Смаленск. Цяпер ужо зусім блізка. А ўнізе цемра, радкія агні. Нейкім унутраным пачуццём Уладзімір адчуў: пад крылом — родны горад. І тут загаварылі зеніткі. Неба пачалі паласаваць пражэктары, але самалёты ўжо разварочваліся над цэлямі: падпольшчыкі ракетамі дакладна ўказвалі, куды скінуць бомбы. Было двайное пачуццё: хацелася як мага больш зрабіць шкоды фашыстам і ў той жа час было апасенне, каб пад бомбы сваіх жа самалётаў не трапілі гэтыя мужныя хлопцы, яго аднагодкі, знаёмыя...



Леанід СУЗІН

ГЭТА БЫЛО ПАД ОРШАЙ...

Яны мужна змагаліся з ворагам, вызваляючы ад карычневай чумы савецкую зямлю. У баях за Аршаншчыну здзейснілі подзвігі сыны многіх народаў — сапраўдныя патрыёты-інтэрнацыяналісты. Імёны многіх з іх носяць вуліцы гэтага горада над Дняпром, яны занесены навечна ў гарадскую Кнігу народнай славы.

Рускі, беларус, украінец, француз — пра іх гераічныя ўчынкі ведае кожны аршанец. Ім і прысвячаем мы сёння свой расказ.

Гэты начны палёт як бы надаў Уладзіміру Завадскаму сілы, мужнасці. «Значыць, недалёка гібель ворага, калі нават там, у глыбокім тыле фашыстаў, нашы людзі, рызыкуючы на кожным кроку, помсцяць акупантам, не здаюцца,— думаў ён. — А калі так, то мы, у каго ў руках зброя, баявая тэхніка, павінны з патроенай сілай граміць ворага...»

Праз колькі дзён ён зноў ляцеў на захад. У нагрудfar кішэні Уладзіміра Завадскага ляжала пісьмо. І адрасавана яно было ў Оршу, тым адважным хлопцам, што кожны дзень тварам у твар сутыкаліся са смерцю, але перамагалі яе, бо моцна любілі Радзіму.

«Дарагія, мілыя хлопцы-аршанцы, як хочацца вас абняць, расцалаваць! — гаварылася ў пісьме. — Мо і памятаеце Валодзьку Завадскага па камсамолу, па аэраклубу, па нашых школьных вечарах. Вам маё гарачае прывітанне я перадаю разам з тымі бомбамі, якія ляцяць на галовы фашыстаў, што здзекуюцца над маім родным горадам. Бачу вашу няна-вісць да карычневай нечысці, захапляюся вамі тут, у небе, што ў разрывах зенітных снарадаў. Я ведаю, як вам цяжка, больш небяспечна, чым мне, але веру, што хутка пераможам акупантаў, вызвалім родную зямлю.

Смерць фашызму!

Ваш Уладзімір Завадскі».

Невядома, ці прачытаў хто тое пісьмо Уладзіміра Завадскага. Але ён верыў, што далёкія сябры ведаюць пра подзвіг экіпажа.

БОЙ НА ПЕРАПРАВЕ

Фашысты ўсімі сіламі імкнуліся ўтрымаць Оршу — буйны чыгуначны вузел Беларусі. Але нашы танкавыя злучэнні неўзабаве прарваліся к гораду, абышлі яго з захаду, адсякаючы падмацаванні гітлераўцаў.

Камандзіру гвардзейскай брыгады палкоўніку Лосіку, у якой танкавым узводам камандаваў гвардыі лейтэнант Сяргей Міт, паступіла данясенне, што з паўночнага ўсходу да аўтамагістралі Масква — Мінск рухаецца буйная варожая калона з танкамі, артылерыйскім узбраенем, бронетранспарцёрамі.

«Разграміць калону, адсеч ёй шлях да адступлення!» — такі быў дадзены баявы загад.

Узводу лейтэнанта Міта было даручана захапіць пераправу праз раку Адроў непадалёк ад вёскі Роскі Сялец. Менавіта на яе і разлічвалі гітлераўцы, узмоцнена ахоўвалі яе.

Марудзіць было нельга. Імклівасць, з якой паявіліся ў распалажэнні праціўніка танкі Міта, пасеяла паніку ў стане ворага. Гэта і выкарысталі танкісты. Напарадзе з тымі бомбамі, якія ляцяць на галовы фашыстаў, што здзекуюцца над маім родным горадам. Бачу вашу няна-вісць да карычневай нечысці, захапляюся вамі тут, у небе, што ў разрывах зенітных снарадаў. Я ведаю, як вам цяжка, больш небяспечна, чым мне, але веру, што хутка пераможам акупантаў, вызвалім родную зямлю.

Смерць фашызму!

Ваш Уладзімір Завадскі».

Невядома, ці прачытаў хто тое пісьмо Уладзіміра Завадскага. Але ён верыў, што далёкія сябры ведаюць пра

шы-танкісты пасцелі вывесці са строю яшчэ пяць гітлераўскіх самаходак. Каля пераправы мітусня, енк. Многа-ства тэхнікі збілася ў кучу, дзеянні ворага паралізаваны. А палаючы савецкі танк усё страляў і страляў, пакуль не ўзарваўся сам. Цаною жыцця лейтэнант Міт і яго баявыя сябры сарвалі намер ворага, паралізавалі прасоўванне буйной варожай групоўкі. У гэтым баі воран страцілі 600 салдат і афіцэраў, 380 здаліся ў палон. У якасці трафеяў нам дасталося 11 танкаў, 370 аўтамашын, 65 гармат, 30 цягачоў...

Радзіма высока ацаніла подзвіг танкіста Сяргея Міхайлавіча Міта. Гэтаму адважнаму воіну родам з вёскі Чарняцова Ноўгарадскай вобласці пасмяротна прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. А ў вёсцы Роскі Сялец Аршанскага раёна, непадалёк ад якой ён здзейсніў свой подзвіг, у сярэдняй школе сцежак мемарыяльны куток, прысвечаны жыццю і ратным справам воіна-камуніста.

ВЫРАТАВАЛІ МОСТ

Беларуская наступальная аперацыя пад кодавай назвай «Баграціён» набірала сілу. Уварваўшыся ў паўночнага ўсходу ў Оршу, нашы войскі замацаваліся на правым беразе Дняпра, які раздзяляе горад на дзве часткі. А на левабярэжжы — праціўнік, два драўляныя масты туды спалены, а як пераправі тэхніку, танкі?

Быў яшчэ цэлы трэці мост — чыгуначны. Але зразумела, што фашысты замініравалі яго. Значыць, пастка, лавушка?

Адказ на пытанне павінны былі даць сапёры. І не толькі далажыць камандаванню пра абстаноўку, але літаральна на вачах у фашыстаў, якія з таго берагу кантраляравалі мост, разміноваць яго, бо ад гэтага ў многім залежаў поспех нашага далейшага наступлення.

Выбралі іх дваіх — старшага сяржанта Ягора Макеева і радавога Антона Юрчанку. Самых вопытных, самых надзейных. Да таго ж удваіх лягчэй непрыкметна для ворага пракрасціся ў яго распалажэнне.

Можна сабе ўявіць гэтых смельчакоў сярод ночы на велізарным мінным полі, якое неабходна было прайсці, каб апынуцца каля моста. А часу — тры гадзіны. На світанку ў бой павінны пайсці танкі, а на мосце іх чакаюць фашысты, якім дастаткова павярнуць ручку падрыўной машыны, каб усё ўзляцела ў паветра...

Цяжка сказаць, колькі яны абясшкодзілі мін, намацваючы іх рукамі, пакуль убачылі на блакітным фоне неба чорныя фермы гіганцкага моста. І вось ён ужо пад іх нагамі, сапёры адну за адной адшукваюць скрынкі з толам. Іх шмат: прама на пешаходнай сцежцы, а потым — унізе, падвешаныя пад пралётамі.

Провад вужакай цягнуўся на той бераг, і пакуль фашысты іх не прыкмецілі Макееў і Юрчанка паспелі перарэзаць яго ў многіх месцах. «Чортава» машынка — паралізавана.

Іх пачалі абстрэльваць, калі воіны яшчэ не паспелі заканчуць справу да канца. Тады адзін адыдзе на агонь, а другі ... Вось у ход пайшлі ... наты. Але галоўнае ... на! Сапёры пачалі ... І ў гэты час узрываюць ... Макеева скінула ... «Відаць, кантузіла» ... неслася ў галаве Юр... ён кінуўся ўніз следам ... дапамагчы таварышу ... плыць з раку.

А ў гэты час, пад... ворага агнём, на мост ... лі нашы «трыццаць... ...».

І цяпер мост, які ... валі адважныя воіны, ... маецца ў Оршы над ... ным Дняпром. За тэты ... віг абодва сапёры ... звання Героя Савецкага ... юза.

Радзіма Антона Сяргеевіча Юрчанкі — ... шчына, ён жыве і ... калгасе «1 Мая» ... скага раёна. Ягор Аф... Макееў са Смаленш... Некалькі гадоў назад ... мёр.

Пастановай бюро Аршанскага гаркома партыі ... канкома гарадскога Са...

дэпутатаў працоўных ... Я. А. Макеева навечна ... сена ў гарадскую Кнігу ... роднай славы. А. С. Юр... ку прысвоена званне ... вага грамадзяніна горада.

ПАЯДЫНАК НАД ДНЯПРОМ

Оршу — гэты буйны ... гуначны вузел, фашысты ... раліся ўтрымаць любой ... ной. Сюды яны сцяг... шмат тэхнікі, горад многа ... зоў аплялі дотамі і дзо... Вось чаму раніцай 23 ... веня 1944 года сюды і ... накіраваны нашы знач... авіяцыйныя сілы, у тых ... ку і падраздзяленні сам... тай-знішчальнікаў з пад... «Нармандыя—Нёман».

Перад эскадрыллямі М... селя Лефеўра стаяла та... задача: кантраляваць у р... Оршы неба з той мэтай, ... на ўсход, туды, дзе разв... лася наша наступленне. ... прабіліся варожыя самал...

Французскія пілоты ... няліся ў паветра, і неўза... ўнізе цёмна-блакітная ст... кай заблішчэў Дняпр. П... шлі крыху ўздоўж рэкі, ... вось і Орша. Але іх не ... трэлі зеніткі. Чаму? Хут... ўсё высветлілася: паляк... нямецкія знішчальнікі. З... чыць, там, на зямлі, чы... сваіх, баяліся перабіць ... Пяць варожых машын ... лічыў Лефеўр. «Малавата ... падумаў чамусьці, — ... цы апошнім часам у та... колькасці вылятаць ... ца...»

І тут жа зразумеў, што ... та група для таго, каб ... цягнуць да сябе ўвагу. А ... імі будуць бамбавозы, ... датковым прыкрыццём.

Часу для роздуму не ... ло. І Марсель прыма... не: тры «ЯКі», у тым ... яго, камандзірскі, устуо... у бой, астатнія — ... пошук!

Камандзір не памы... Ён бачыў, што. ... спрабавалі ўцякаць у ... ным для іх напрамку, ... тым разлікам, каб іх ... лі. А Лефеўр наяжджа ... І збіў асабіста два ... самалёты. Астатнія ... эскадрыллі сапраўды ... калі групу бамбардзір... каў, адсеклі ім ... фронту. Баявая задача ... выканана.

Праз дзень Марсель Лефеўр збіў яшчэ адзін варожы самалёт у беларускім небе.

Сведкам апошняга вылету адважнага камэска быў яго баявы таварыш Францыс дэ Жофр, які жывы і цяпер. З раніцы яны вылецелі ў бой. Оршы. Шукалі сустрэчы з фашысцкімі асамі, пакуль свой аэрадром, і ў гэты час ўдарыў па кабіне самалёта Лефеўра. Машына «клюнула» носам і, губляючы раўнавагу, пайшла ўніз. Але параненаму Марселю ўдаецца выратаваць машыну, і неўзабаве яго вядучы Францыс дэ Жофр чуе ў навушніках спакойны голас камандзіра: «Выходзь наперад, Францыс, хутка аэрадром. А я следам за табой...»

А самалёт Лефеўра ўжо дыміў, было цяжка дыхаць. Можна было пакінуць машыну, скокнуць з парашутам, але Марсель быў сапраўдны воін, ён ведаў, што значыць у грозны ваенны час баявы самалёт, на якім можна пайсці ў бой і заўтра, і пасля-заўтра.

І Лефеўр пасадзіў самалёт. Насустрач бягуць сябры, імчыць санітарная машына. Марсель выскоквае з кабіны, адкуль ужо паўзуць касмылі полымя, гарыць і яго вопратка...

Ён памёр у шпіталі: апёкі былі вельмі цяжкія. Слаўны сын Францыі збіў 11 фашысцкіх самалётаў, а 2 падбіў. У лютым 1944 года ён, ветэран і адзін з заснавальнікаў палка французскіх лётчыкаў-добраахвотнікаў быў узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга і французскім — Ганаровага Легіёна. Пасмяротна яму прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

АДЗІН НА АДЗІН З ТАНКАМІ

28 чэрвеня 1944 года крыху на поўдзень ад Оршы ў бой уступіў полк, у якім служыў старшы сяржант Уладзімір Аляксеевіч Галаскокаў. На ўскраіне лесу немцы сканцэнтравалі значную колькасць танкаў і артылерыі, на падаўленне іх агню камандзір палка накіраваў чатыры нашых самаходных гарматы.

Але вораг быў напагатове. Тры нашыя машыны загарэліся літаральна адна за адной ад шчыльнага загараджальнага агню.

Самаходка, у якой знаходзіўся Галаскокаў, ухілілася ад прамога нападання, але асколак снарада цяжка параніў камандзіра. Галаскокаў прымае камандаванне на сябе, і гармата, імкліва маруючы, трапна б'е па варожых пазіцыях.

У разгар бою Уладзіміра Аляксеевіча параніла ў ногі. Але толькі на кароткі момант замаўчала гармата: нязгледзячы на слабасць ад страты крыві, старшы сяржант праіграваў страляць. Ён сам заражаў, сам наводзіў гармату, трапна пасылаў снарады на цэлях. А іх парадзе нашы самаходкі, фашысты вывелі са схованак свае машыны. І вось ад удараў Галаскокава загараўся адзін варожы танк, другі, трэці, чацвёрты...

Ужо ў шпіталі Уладзімір Аляксеевіч даведаўся, што на дапамогу падаспелі чырвонаармейцы «трыццацьчацвёркі». Ворага імклівасці і ўмацавання, наступленне працягвалася. За подзвіг пад Оршай адважнаму артылерысту прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Сібірак У. А. Галаскокаў жыве і працуе ў Омску.